


# СПІС КІРУЮЧЫХ ОРГАНАЎ БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ЖУРНАЛІСТАЎ








# Трэба ўзяць у свае рукі ўладу. Чацвёртую

## We Should Come into the Fourth Estate

Беларускія СМІ, на працягу дзесяцігоддзяў існаваўшыя ва ўмовах камандна-адміністрацыйнай сістэмы, падчас "перабудовачнага рамантызму" глынулі свежага паветра і зноў апынуліся ў стане, калі не могуць задавальняць інфармацыйныя патрэбы жыхароў сваёй краіны, рэалізаваць правы грамадзян на атрыманне своечасовай, сумленнай, праўдзівай інфармацыі. Ганебная з'ява нашага жыцця, што дасягоння адсутнічаюць умовы развіцця свабоды слова. А тым часам у дзяржаўным тэле- і радыёэфіры пануе прынцып замоўчвання, фільтравання інфармацыі; нішчыцца перспектыва стварэння сістэмы недзяржаўных электронных СМІ.

Асэнсаванне менавіта гэтай сітуацыі з чацвёртай уладай і падштурхнула год назад сяброў арганізацыйнага камітэта да стварэння Беларускай асацыяцыі журналістаў. Тады былі вызначаныя і асноўныя мэты гэтага грамадскага аб'яднання: юрыдычная, маральная і іншая падтрымка СМІ і асобных журналістаў, вучоба, наладжванне міжнародных сувязяў і супрацоўніцтва з іншымі журналісцкімі арганізацыямі, стажыроукі і семінары, стварэнне юрыдычнай службы, фонду сацыяльнай падтрымкі звольненых па палітычных матывах калег, многае іншае, што скіравана на станаўленне чацвёртай улады ў нашай краіне.

Такой чацвёртай улады, якая б сама сябе магла абараніць, якая б заслугоўвала павагі як з боку грамадзян Беларусі, гэтак і з боку заканадаўчай, выканаўчай, судовай улад, каб засталіся ў мінулым ігнараванне і грэбаванне грамадскай думкай, занядбанне ідэі свабоды мас-медыя.

Толькі пры ўмове насычэння інфармацыйнай прасторы незалежнай, аб'ектыўнай інфармацыяй самага шырокага спектра магчыма ўмацаванне на Беларусі дзяржаўнасці, правядзенне эканамічных рэформ, пабудова цывілізаванага грамадства.

---

For decades, Belarusian media worked under the pressure of the administrative system. At the time of "perestroika romanticism," our press had some fresh air, but today Belarusian journalists again cannot satisfy information demands of the population and provide the citizens with timely and truthful information. There are no conditions for freedom of press in Belarus today. The state radio and television screen and distort information; there are no prospects for non-state electronic media.

Analysis of such a situation with the Fourth Estate in Belarus was the main reason for the formation of the Belarusian Association of Journalists about a year ago. The main goals of this organisation are as follows: legal, moral and other support to journalists, professional training, establishing of international relations and co-operation with other journalist organisations, creation of a legal service and a fund of social protection for journalists dismissed for political reasons. The activity of the Association is aimed at the establishment of the Fourth Estate in our country. The press should be able to protect itself; it should be respected by the citizens and by the legislative, executive and judicial branches. Public opinion and the idea of press freedom should not be ignored.

State formation, economic reform and creation of a normal society in Belarus will be possible only when there is an information space filled with independent and objective information.

**Рэдакцыйная калегія**
**Editorial Board**

У фокусе БАЖ

# ВАЙНА СУПРАЦЬ СМІ

# WAR AGAINST MEDIA

## Хроніка парушэнняў свабоды слова і друку, правоў журналістаў у Беларусі ў 1996-м годзе

## Chronology of the violations of Freedom of Speech and Press,rihgts of journalists in the Republic of Belarus during the year 1996.

### 9 СТУДЗЕНЯ / JANUARY

... у дзень адкрыцця першай сесіі Вярхоўнага Савета Беларусі адразу пасля выступлення прэзідэнта А. Лукашэнкі спыненая прамая тэлетрансляцыя на Беларускім тэлебачанні, а таксама тэлеперадача з залы пасяджэнняў ВС на маніторы ў прэс-цэнтры. Шматлікія пастановы Вярхоўнага Савета аб парадку асвятлення пленарных пасяджэнняў парламенту адкрыта ігнаруюцца кіраўніцтвам Белтэлерадыё.

... the day of the first session of the new elected Suprime Soviet. Life broadcasting of the session via TV and Radio (as well as on the Parlrment Press Center monitors) has been suddenly interrupted right after the speech of Alexandre Lukashenko, President of Belarus. All resolutions of the Parlament on the life coverage of session via Broadcasting Media are ignored by the Panal of directors of the State Tv-Radio Company.

### 26 ЛЮТАГА / FEBRUARY

... прынятая пастанова Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 144 ( у афіцыйным друку не публікавалася) «Аб упарадкаванні паліграфічнай дзейнасці». Згодна з пастановай, выдавецкая і паліграфічная дзейнасць патрабуюць спецыяльнага дазволу (ліцэнзіяў). Суб'ектам гаспадарання ( юрыдычным і фізічным асобам), якія ажыццяўляюць паліграфічную дзейнасць, было прадпісана атрымаць да 1 красавіка 1996 г. у Дзяржаўным камітэце па друку ліцэнзіі на гэты від дзейнасці.

... the day when the resolution #144 " Regulation of the publishing Activity" has been adopted by the Cabinet of Ministers (but had never appeared in official press). According to the resolution any type of printing and publishing activity needs special permission ( licences). Subjects of management (phisical and juridical persons) acting in printing business were obliged to get the State Print Committee licences by the 1st of April 1996.





У фокусе БАЖ

### 17 САКАВІКА / MARCH

... указам прэзідэнта Беларусі зняты з пасады галоўны рэдактар органа Вярхоўнага Савета «Народная газета» Мікалай Галко. Гэта адбылося акурат праз год пасля адхілення ад пасады галоўнага рэдактара «Народнай газеты» дэпутата ВС XII-га склікання Іосіфа Сярэдзіча – таксама на падставе прэзідэнцкага ўказу, без узгаднення з заканадаўчым органам улады. У абодвух выпадках былі парушаныя правы заснавальніка выдання, а таксама правы рэдакцыйнага калектыву, замацаваныя ў Законе аб друку.

... the day when " Narodnaya Gazeta" (organ of the Suprime Soviet of Belarus) Editor-in-chief Mikhalaj Galko has been resigned under the President A.Lukashenko decree. That happened exactly a year after "Narodnaya Gazeta" previous Editor-in-Chief, delegate of the Suprime Soviet 12th convocation Joseph Syaredzitch had been removed from office on the same reason after the same decree and without any talk with the legislative power representatives. In both cases the rights of the founder of the edition as well as the rights of the editorial stuff which are under the Law protection were flargantly violated.

### 24 КРАСАВІКА / APRIL

... у газеце «Наша Ніва» супрацоўнікі КДБ правялі вобыск у пошуках кампрамату на журналіста Славаміра Адамовіча, які быў арыштаваны ў сувязі з мінулагодняй публікацыяй у віцебскай газеце «Выбар» вершу «Убей президента». У выніку шматгадзіннагаператрусу ў рэдакцыі быў канфіскаваны шэраг матэрыялаў і лісты чытачоў з рэдакцыйнага архіву.

Аналагічнаму вобыску падверглася рэдакцыя газеты «Беларуская маладзёжная», дзе былі канфіскаваныя лістоўкі БНФ.

... the day when KGB agents searched an edition "Nasha Niva" in hope to find some compromative materials on journalist Slavomir Adamovich, who had been arrested in connection with a published in Vitzebsk newspaper "Vybar" (Choice) poem "Kill the President. " As a result of the detailed search a number of editorial articles and readers' letters were confiscated from the editorial archives.

The same search took place at the editorial office of the newspaper "Belaruskaya Maladzyozhnaya" where they cofiscated BNF (Peoples National Front) leaflets.

### 26 КРАСАВІКА / APRIL

... у дзень дзесятай гадавіны чарнобыльскай трагедыі ў выніку сутыкнення мірных маніфестантаў з сіламі аховы правапарадку пацярпелі, сярод іншых, шматлікія журналісты, якія выконвалі свой прафесійны абавязак. Карэспандэнт радыё «Свабода» Эдвард Тарлецкі у выніку ўдару міліцэйскай дубінкай атрымаў сур'ёзную траўму галавы. Быў жорстка збіты міліцыянтамі карэспандэнт польскай «Газеты выборчей» Цэзары Галіньскі. Сярод пацярпелых апынуліся таксама карэспандэнт РТР Леанід Свірыдаў, намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Спадчына» Леанід Ракіцкі і інш.

... the day of the 10th anniversary of the Chernobyl tragedy. The journalists covering the Demonstration got into clashes between peaceful demonstrators and Police forces. As a result many of them got serious injuries. Correspondent of the Radio Liberty Edward Tarletsky had been hitted with a truncheon and got a strong head injuries. Correspondent of the Polish newspaper "Gazeta Vyborcha" Tzezary Galinsky was cruely bitten with the militia. Russian Tv company "RTR" correspondent Leonid Sviridov , Editor-in-Chief of the "Spadchina" (Heritage) magazine Vyacheslau Rakitzki and some others were among those who suffered.

Акрамя таго, органамі міліцыі былі затрыманыя па абвінавачванні ў «дробным хуліганстве» галоўны рэдактар другой праграмы Беларускага радыё( «Радыё 2») Уладзімір Дзюба і незалежны журналіст Алег Трызна.

Moreover Editor-in-Chief of the State Radio service 2 channel Uladzimir Dzuba and independent journalist Aleh Tryzna were arrested by the police under the accusation of ruffianly behaviour.

**1** ТРАЎНЯ / MAY

... падчас святочнай дэманстрацыі ў Мінску быў затрыманы супрацоўнікамі аховы прэзідэнта фотакарэспандэнт газеты «Рэспубліка» Аляксандр Кушнер, які быў адпушчаны пасля таго, як фотастужкі былі засвечаныя. Загад засвяціць адзнятую стужку атрымала і карэспандэнт «Народнай газеты» Марыя Жылінская.

Пасля заканчэння дэманстрацыі група невядомых асобаў пад пагрозай сілы прымусіла здымачную групу тэлекампаніі НТВ аддаць ім рабочыя відэакасеты. У іншым месцы горада аналагічны інцыдэнт адбыўся з карэспандэнтам РТР Леанідам Свірыдавым, але яму ўдалося зачыніцца ў аўтамабілі.

Быў затрыманы і правёў некаторы час у міліцэйскім пастарунку фотакарэспандэнт Уладзімір Кармілкін.

... the day of peaceful Demostration. Photo-correspondent of the newspaper "Respublica" Alexandre Kushner was detained by the president security forces. He was released when they had spoiled his film. Correspondent of the newspaper "Narodnaya Gazeta" Marya Zhylinskaya was also forced to spoil the film.

When the demostaration was over NTV (independent television, Moscow) crew being under the threat had to give master tapes to a group of stranges. At the same time but another part of the city correspondent of the Russian television Leonid Sviridov happened to be at the same type of the situation but he managed to lock himself in the car and save the shootage.

Photo-correspondent Uladzimir Karmilkin had been arrested by the police and forced to spend some time at the police station.

**7** ЧЭРВЕНЯ / JUNE

... старшыня Дзяжкамдруку Беларусі Уладзімір Бельскі паведаміў пра афіцыйнае папярэджанне на адрас незалежнага выдання «Белорусская деловая газета» у сувязі з публікацыяй на яе старонках матэрыялаў, прысвечаных службе аховы прэзідэнта Беларусі, а таксама іншых спецслужбаў, статус якіх не вызначаны Канстытуцыяй і дзеючымі законамі. Папярэджанне было абскарджана «БДГ» як неабгрунтаванае і неадпаведнае законам аб друку і аб дзяржаўнай тайне.

... the day when the chairman of the State Print Committee Vladimir Belski announced an official warning to the newspaper "Belaruskaya Delovaya Gazeta". The reason of it was an article which appeared in the newspaper and investigated the activity of the special President security service as well as a number of other secret services (non of them got any qualification neither by the Constitution nor by the Law). Newspaper "Belaruskaya Delovaya Gazeta" refused to accept warning as groundless and not corresponding with Press and State secret Laws.





**9** ЛІПЕНЯ / JULY

... указам прэзідэнта Беларусі орган Вярхоўнага Савета «Народная газета» пераратвораны ў акцыянернае таварыства з кантрольным пакетам акцый у дзяржавы. Кіраўніком АТ паводле ўказу прызначаны галоўны рэдактар «Белорусской нивы» Міхаіл Шыманскі. Абраны перад гэтым законным чынам на пасаду галоўнага рэдактара «Народнай газеты» дэпутат Леанід Юнчык не змог прыступіць да працы.

... the day when newspaper "Narodnaya Gazeta" was transformed into the Joint Stock Company according to the President's Decree. As a result main share holding belongs to the state. Editor-in-Chief of the newspaper "Belaruskaya Niva" Mikhail Shymanski was appointed as a director of the Joint Stock Company. Previosly legally elected "Narodnaya Gazeta" Editor-in-Chief, delegate of the Parlament Leanid Yunchyk could not get into his office.

**23** ЖНІЎНЯ / AUGUST

... старшыня Дзяржкамдруку Уладзімір Бельскі ў інтэрв'ю газеце «Звязда» заявіў, што камітэт мае права «кантраляваць выкананне законаў дзяржавы», а таксама фінансава караць выданні за «парушэнне законаў аб'ектыўнасці ў выкладанні інфармацыі» – г. зн. камітэт бярэ на сябе функцыі дзяржаўнай цэнзуры. Акрамя таго, з яговых словаў стала вядома, што ў законе «Аб дзяржаўнай падтрымцы СМІ», які распрацоўваецца ў Дзяржкамдруку, прыярытэт у датацыях будзе надавацца «сацыяльна значным выданням» на падставе так званага «дзяржаўнага рэестру». Беларускамоўныя выданні, якія карысталіся дагэтуль дзяржлатацыямі – «Голас Радзімы», «Літаратура і мастацтва», «Наша слова» – плануецца аб'яднаць у адно.

... the day when the Chairman of the State Print Committee Vladimir Belski announced in his interveiw for the newspaper "Zvyazda" that the Belarusian State Print Committee was elaborating the bill " State Support of Mass Media". A number of statements in this bill are in contradiction to the Press Law as well as to some articals of the Constitution which does not allow the monopolisation of Mass Media. The main idea is to create so called "state regester" of editions which is going to become a reason for the state subsidies to the "socially significant" editions. By the way it is not clear who would decide upon the "social significanse" of this or that edition. He also mentioned that the State Print Committee is ready to come up with an idea to combine a number of literary, artistic, social and political editions (such as " Voice of the Motherland", "Literature and Art", "Our word", "Culture" ) and create the one instead. The same proccess of unification was provided for the editions "Spadchyna" ( "Heritage", "Belaruskaya Minuwschyna" ( Belarusian Past") , "Belaruski Gistarychny Chasopis" ( "Belarusian Historical Magazine").

**1** ВЕРАСНЯ / SEPTEMBER

... спынілася вяшчанне радыё «101,2» – адзінай незалежнай беларускамоўнай радыёстанцыі у дыяпазоне FM. Падставай стаў загад дзяржаўнай інспекцыі электрасувязі Рэспубліканскаму радыётэлецэнтру спыніць эксплуатацыю перадатчыка на частаце 101, 2 Мгц да высвятлення пры-

... the day when Radio 101.2 which was the only one non-state belarusian-language radiostation had been switched off air under the reason that it creats hindrances in the special radio-telephone communication "Altaj" receiving channels. The notification from the Ministry of Communicati-

чын перашкод, якія нібыта стварае перадатчык радыё для спецсувязі. Кіраўніцтву радыёстанцыі аб гэтым загадзя нічога не паведамлялася, і калектыў быў пастаўлены перад фактам без аніякіх тлумачэнняў з боку ўладаў. Журналісты радыёстанцыі расцанілі гэтую акцыю як непрыхаваны наступ на свабоду слова.

on/ which actually was an inner-official document/ had been given to the station before 24 hours. There were no previous reproof or warning as well as following comments. Journalists qualified the case as the next attack in turn of the authorities on the Freedom of Speech and on the activity of independent Mass Media.

**2** ВЕРАСНЯ SEPTEMBER

... у выніку праверкі падаткавай інспекцыі "замарожаныя" разліковыя рахункі КМП «Белорусский рынок», на газету накладзены штрафныя санкцыі ў памеры 610 млн. беларускіх рублёў. Падставай стаў прамежкавы акт праверкі, згодна з якім рэдакцыя недастаткова дакументавала спісанне «нерэалізаваных экзэмпляраў уласнай газеты». Аналагічныя меры былі прынятыя падаткавай інспекцыяй адносна шэрагу іншых незалежных выданняў – «Белорусская деловая газета», «Белорусская газета», «Свабода» і інш., якія абвінавачваюцца ў тым, што яны нібыта хаваюць прыбытак за кошт няўлічанай рэшты накладу. Кампанія фінансавых праверак пачалася практычна адначасова ва ўсіх згаданых выданнях у апошняй дэкадзе жніўня.

... the day when commercial enterprise "Belaruski Rynok" bank accounts were frosen. Newspaper "Belaruski Rynok" was fined (amount of fee 610 mln belarusian roubles). The reason for the fee was an act of intermediate checking . According to the act the writing off documentation on the unsaled copies of the newspaper was not well detailed. The same measures were untaken by the tax police against some other independent editions such as "Belarusakaya Delovaya Gazeta", "Belaruskaya Gazeta" , "Svoboda" etc. which were alligated in hiding thier profits by not taking the stock of the rest of copies. Last decade of August financail checking compagne was launched simultaniously for all editions mentioned above .

**3** ВЕРАСНЯ SEPTEMBER

... былі адхіленыя ад працы ў жывым эфіры супрацоўнікі другой праграмы дзяржаўнага радыё. У якасці матыву абмежавання прафесійных правоў журналістаў намеснік старшыні Белтэлерадыё назваў тое, што ў эфіры на гэтай праграме прагучала выступленне аднаго з віцэ-спікераў беларускага парламенту, у якім крытычна ацэньваліся мэты і метады правядзення рэферэндуму, ініцыяванага прэзідэнтам.

... the day the State Radio Service 2 channel journalists have been taken off air. The Deputy Chairman of the State Tv -Radio company Vladimir Yadrentzev explained the limitation of the professional rights of journalists as natural reaction after the critical estimation of aims and methods of the referendum which was initiated by the President. The critical information was a part of the vice-chairman of the Parlament interview for the Radio 2 channel.

**5** SEPTEMBER

... у гэты дзень часопіс "Спадчына" атрымаў дакумент з Дзяржаўнага камітэта па друку, падпісаны кіраўніком фінансавага аддзела спадарыняй Сліжэўскай, згодна з якім скарачалася дзяржаўная фінансавая падтрымка гэтага выдання. Гэта значыла, што дзяржава ўвяла ў дзеянне механізм фінансавага ціску на беларускамоўныя гістарычныя і культурніцкія выданні.

... the day when "Spadchyna" ( "Heritage") magazine received the document fron the State Print Committee signed by the cheif of the financial committee department Mrs. Slizhewskaya informing that the magazine reduced the state financial dotation which meаns the starting of the financial pressue mechanism work against the Belarusian-language historical and cultural edition.

**18** ВЕРАСНЯ SEPTEMBER

... аўтар і вядучы праграмы «Рэферэндум» на Беларускім тэлебачанні Юры Дудзінаў, які запрасіў журналістаў незалежных СМІ на запіс гутаркі з дарадцам прэзідэнта Сяргеем Посахавым, сваімі зняважлівымі выказваннямі фактычна сарваў запіс перадачы «Рэферэндум». Журналісты, абураныя паводзінамі вядучага, у знак пратэсту пакінулі студыю тэлебачання. Пазней Юры Дудзінаў у інфармацыйнай праграме «Панарама» абвінаваціў у інцыдэнце... журналістаў

... the day when the author and presenter of the State TV programme "Referendum" Yury Dudzinaw invited independent mass media journalist to meet President Advisor Syargei Posakhov. Yury Dudzinaw with his offensive and provocative expression had practically brought to nought the filming of the programme. Journalists being offended had left the studio in protest. But later in the news programme "Panarama" Mr.Dudzinaw claimed in that incident .... the journalists.

**20** ВЕРАСНЯ SEPTEMBER

... у гродзенскі гарадскі суд паступіла прадстаўленне ад Дзяржкамдруку Беларусі ад 16. 09. 96 г. аб закрыцці газеты «Пагоня» на падставе вынесеных раней на працягу года двух папярэджванняў на адрас рэдакцыі ў парушэнні закону аб друку. Папярэджванні носяць цалкам адвольны, ідэалагічны характар і пярэчаць прынцыпам свабоды слова.

... the day when the Grodno City Court received the official State Print Committee document ( from September 16, 1996) to close down the newspaper "Pagonya". The reason of the closure were two earlier warnings in violating the Print Law which in fact were nothing more then ideological propaganda and contradiction to the principals of the Fredom of Speech.

**30** ВЕРАСНЯ SEPTEMBER

... спынены выхад у эфір прыватнай радыёстанцыі НБК у Гродне, заснавальнікам якой з'яўляецца Ніна Палуцкая. Радыёстанцыі загадана вызваліць займаныя памяшканні на абласным радыё. Гэтаму папярэднічаў выхад у эфір перадачы, у якой цытаваўся зварот Старшыні ВС Беларусі С. Шарэцкага да народу.

... the day when the on air activity of the private radiostation NBK in Hrodna ( owner is Nina Palutzkaya) has been suspended. Radiostation was ordered to leave the building of the regional state radio where the radiostation was broadcasting from. Before the radiostation was closed it had broadcasted a programme which included among the other issues the Chairman of the Parlament Syamyon Sharetzki statement about the political situation in Belarus.

SOS !

# "Мы заўсёды былі з вамі. А вы?"

# "We have always been with you. Will you suport us now?"

Радыё 101.2 звяртаецца да беларускай грамадскасці, дэпутатаў Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, дыпламатычнага корпусу, сродкаў масавай інфармацыі, да ўсіх прыхільнікаў радыёстанцыі з заявай.

30 жніўня ў пятніцу а 17.30 напярэдадні выхадных дзён калектыў Радыё 101,2 атрымаў па факсе ўнутрыслужбовы дакумент Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь, у якім сцвярджалася:

"В целях исключения помех в приемных каналах ЦС РТС "Алтай" эксплуатацию передатчика на частоте 101,2 Мгц и использованием АФС на опоре по адресу: ул.Коммунистическая,6, прекратить с 1.09.96 г. Нач. БелГИЭ В.А.Никонов."

Калектыў Радыё 101,2 лічыць патрэбным давесці да Вашага ведама, што перадатчык Радыё 101,2 знаходзіўся на балансе дзяржаўнай арганізацыі РРТПЦ, якая брала на сябе абавязацельствы па яго абслугоўванні і эксплуатацыі. За тэрмін існавання ў эфіры (Радыё 101,2 выйшла ў эфір 21.07.1995) мы не атрымалі ніводнай заўвагі і ніводнага папярэджання.

Варта нагадаць, што паведамленне аб выключэнні перадатчыка (гэта азначае спыненне работы радыёстанцыі) было атрымана за суткі. Ясна, што за такі кароткі тэрмін немагчыма было зрабіць адпаведныя захады, каб не пацярпелі інтарэсы соцен тысяч нашых слухачоў, замежных радыёстанцый "Нямецкая хваля", "Бі-Бі-Сі", "Польскае радыё", чые ліцэнзійныя праграмы гучалі ў нашым эфіры, дзелавых партнёраў, а таксама супрацоўнікаў рэдакцыі Радыё 101.2, якія імгненна сталі беспрацоўнымі.

Лічым неабходным звярнуць увагу і на такую акалічнасць: Радыё 101,2 - адзіная ў краіне недзяржаўная беларускамоўная радыёстанцыя, і яе дзейнасць была прыпынена менавіта ў дзень апублікавання праекту новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, напярэдадні важных грамадска-палітычных падзеяў у жыцці дзяржавы - правядзення рэферэндуму, давыбараў у Вярхоўны Савет і г.д.

Мы расцэньваем гэты выпадак з Радыё 101,2 як чарговы наступ уладаў на свабоду слова і недзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, як грубае парушэнне канстытуцыйных правоў грамадзянаў Беларусі на атрыманне аператыўнай праўдзівай інфармацыі, як спробу выканаўчай улады абмежаваць інфармацыйную прастору краіны.

Мы заклікаем усіх Вас не адседжвацца і не змаўчаць, праявіць салідарнасць і аб'яднаць свае намаганні для спынення самавольства і беззаконня, для абароны правоў чалавека. Мы заўсёды былі з вамі. А вы?




Radio 101.2 appeals to the broad public of Belarus, delegates in the Suprime Soviet of the Republic of Belarus, deplomatic corps, mass-media and to all its listeners:

On Friday August 30 just before the weekend late in the afternoon ( around 17.30) Radio 101.2 got a fax message which was an inner-official document from the Ministry of Communications of the Repuplic of Belarus that notifys the following:

" In order to avoid hindrances in the radiotelephone communication station "Altaj" receiving channels the usage of the FM 101.2 MHz transmitter with its AFS disposed in the centre of Minsk (address: 6, Communisticheskaya str.) should be ceased starting from September 1, 1996.

Chief of the State inspection of the electronic communication

Nikonov V.A."


Radio 101.2 considers it would be necessary to let you know that the station transmitter was on balance of the state organization — the Republican Radio and TV Transmitting Centre, which had taken all the commitments on its attendance and expluatation. For the whole working period ( Radio 101.2 appeared on air on July 7, 1995 ) we had never receive any official reproof or warning.

We should remind that the present notification (that means the end of working of the station) had been given to us before 24 hours. So, it goes without saying that for a such short period of time it is practically impossible to take some concrete steps to protect the interests of hundred of thousands listeners of the Radio 101.2; foreign radio stations "Deutsche Welle", "BBC World Service", "Polskie Radio", which licence programmes we've been broadcasting with our radio station; business partners and proper editorial staff of the Radio101.2, who became jobless immideately.


We would like to pay your attention onto the following circumstance: Radio 101.2 is the only one non-state belorussian-language radio station and its activities had been suspended just that very day of publishing the project of a new wording of the Constitution of the Republic of Belarus, on the eve of very important new social and political events in the life of our state – carrying out a referendum, the second round of the parlamentary elections and etc..

The case that happened with Radio 101.2 we are qualifying as the next attack in turn of the authorities on the freedom of speech and on the independent mass-media, as flagrant violatoin of constitutional rights of people of Belarus to get an uptodate and truthful information, as an attempt of the executive power to restrict all the informational area of the country.

We call everybody not to sit snug in a silence, but to show solidarity and to consolidate all our efforts to stop arbitrariness, lawlessness and to defend human rights. We have been with you always. And you?



*Рысунак Аркадзія ГУРКАГА*





Рэха падзеі

# "РЭПАРЦЁРЫ БЕЗ МЕЖАЎ"

*Міжнародны Сакратарыят*
*Парыж, Францыя*
*тэл. (33) 1 44 83 84 84,*
*факс (33) 1 45 23 11 51*

*Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь*
*сп. Аляксандру Лукашэнку*

*Парыж, 3 верасня 1996 года*

*Сэр,*

*"Рэпарцёры без межаў"- незалежная арганізацыя па абароне свабоды друку ва ўсім свеце - хоча выказаць свой пратэст супраць адхілення ад эфіру прыватнай радыёстанцыі РАДЫЁ 101.2 FM.*

*Згодна з атрыманай намі інфармацыяй, з 1 верасня Міністэрства сувязі і інфарматыкі прыпыніла вяшчанне РАДЫЁ 101.2, адключыўшы перадатчык, які належыць Міністэрству сувязі. За два дні да гэтага незалежная мінская станцыя атрымала з Міністэрства факс з тлумачэннем прынятага рашэння: "стварэнне памехаў на дзяржаўных частотах". Паколькі ніякіх іншых варыянтаў хвалевага дыяпазону не было прапанавана, РАДЫЁ 101,2 FM заклікае зрабіць захады супраць незаконнага адхілення ад працы.*

*Радыё 101.2 выйшла ў эфір у 1995 годзе і ажыццяўляе вяшчанне музычных праграмаў і выпускаў навінаў на мінскі рэгіён і пераважна на сацыяльна актыўную аўдыторыю.*

*"Рэпарцёры без межаў" пратэстуюць супраць закрыцця РАДЫЁ 101.2 - адной з нешматлікіх незалежных радыёстанцый у Беларусі. Мы просім зрабіць ўсё, што ад Вас залежыць, каб вярнуць як мага хутчэй станцыі яе эфірную частату і каб яна без перашкодаў аднавіла сваё вяшчанне.*

*Мы выказваем Вам падзяку за ўвагу да гэтага пытання і чакаем Вашага адказу.*

*Глыбока шануючы Вас,*

*Робэрт Мэнарт,*
*генеральны сакратар.*

Гэты дакумент мы дасылаем: у Міністэрства культуры і друку, Саюз журналістаў, "Белорусскую деловую газету", "Народную газету", "Звязду", Пасольства Францыі ў Беларусі, Беларускае Пасольства ў Францыі, Агенцтва Франс-Прэс у Маскве, Маскоўскае аддзяленне Ройтар, "Эмнісці Інтэрнэшнл", "Артыкул 19", Канадскі камітэт па абароне журналістаў, Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа, Камісія ААН па правах чалавека, Камітэт па абароне журналістаў, Лігу па правах чалавека, Міжнародную Федэрацыю па правах чалавека, Міжнародную федэрацыю выдаўцоў газет, Міжнародную федэрацыю журналістаў, Фонд за свабоду выказванняў, Каталог па цэнзуры, Міжнародны ПЭН-Цэнтр, Міжнародны інстытут прэсы, ЮНЕСКО, Сусветны Камітэт свабоды прэсы.







Віншуем!

# ПЕРШАЯ МІЖНАРОДНАЯ ПРЭМІЯ БАЖ

**У намінацыі:**

| | |
|---|---|
| *"За лепшы інфармацыйны матэрыял"* | Аляксандр МАНЦЭВІЧ, рэдактар "Рэгіянальнай газеты" (г.Маладзечна) за журналісцкае расследванне |
| *"За лепшы аналітычны матэрыял"* | Юры ДРАКАХРУСТ, аглядальнік "БДГ", "Имя" за цыкл аналітычных артыкулаў |
| *"За лепшы фатарэпартаж"* | Марыя Жылінская, фотакарэспандэнт "Народнай газеты"<br>Сяргей ГРЫЦ, загадчык аддзела "Народнай газеты" |
| *"За лепшы радыёматэрыял"* | Вольга КАРАТКЕВІЧ, Вольга БАБАК — шэф-рэдактары "Радыё 101.2" |
| *"За лепшы тэлематэрыял"* | Леанід СВІРЫДАЎ — кіраўнік беларускага прадстаўніцтва тэлекампаніі РТР<br>Аляксандр СТУПНІКАЎ, дырэктар прадстаўніцтва тэлекампаніі НТВ па Беларусі і Польшчы |
| *"За грамадзянскі ўчынак"* | Барыс ХАМАЙДА, гал.рэдактар "Выбар" (г.Віцебск)<br>Мікалай МАРКЕВІЧ, гал.рэдактар "Пагоня" (г.Гродна)<br>Ніна ПАЛУЦКАЯ, рэдактар радыёстудыі "НБК" (г.Гродна) |

## ДЫПЛОМ "Ганаровы Крумкач"


уручаўся "ў знак асаблівых заслуг перад уладамі, за высокія маральна-ідэйныя якасці, узлёт фантазіі і непаўторнае майстэрства"



| | |
|---|---|
| *за май 1996 г.* | *Ігару Грышану, супрацоўніку Белтэлерадыёкампаніі* |
| *за чэрвень* | *Аляксандру Зімоўскаму, супрацоўніку Белтэлерадыёкампаніі* |
| *за ліпень* | *Уладзіміру Зуеву, супрацоўніку "Знамя Юности"* |
| *за жнівень* | *Кіму Ягораву, "калектыўнаму мозгу" "Знамя Юности"* |
| *за верасень* | *Святлане Дабрыянік, супрацоўніку Белтэлерадыёкампаніі* |

# КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ УСЁ






**Лаўрэат першай Міжнароднай прэміі БАЖ у намінацыі "За лепшы фотарэпартаж"**

## ГРЫЦ Сяргей Васільевіч

*фотажурналіст 1963 года нараджэння. Фатаграфіяй займаецца з 1979 года. Гераіня першых яго здымкаў — каханая. Зараз — штатны фотакарэспандэнт "Народнай газеты". Акрэдытаваны ў Беларусі таксама ад сусветнага інфармацыйнага агенцтва Associated Press. У адрозненне ад герояў многіх яго цяперашніх здымкаў, міралюбівы.*












*Як сведчаць гэтыя фотаздымкі, Сяргей Грыц заўжды своечасова аказваўся на месцы самых гарачых падзей 1996 года. Для фотакарэспандэнта гэта — важная складаючая пасяховай працы. А што праца С.Грыца на ніве журналістыкі пасяховая, сведчаць не толькі яго аўтарытэт у Беларусі, не толькі прысуджэнне яму першай Міжнароднай прэміі БАЖ, але і той факт, што яго здымкі — у тым ліку і апублікаваныя ў бюлетэні БАЖ — абыйшлі старонкі шмат якіх буйных выданняў замежжа.*



Чацвёртая ўлада

# ЗАЯВЛЕНИЕ
## БЕЛОРУССКОЙ АССОЦИАЦИИ ЖУРНАЛИСТОВ

**Как следует из высказываний официальных лиц, в Госкомпечати Беларуси разрабатывается законопроект «О государственной поддержке СМИ». Насколько можно судить, некоторые положение этого проекта противоречат не только закону о печати, но и действующей Конституции, не допускающей монополизацию средств массовой информации. Разговор, в частности, идет о создании так называемого «государственного реестра» изданий, на основании которого планируется предоставлять государственные дотации «социально значимым изданиям». Кто будет определять «соцзначимость» того или иного издания — не ясно.**

**Известно однако, что в Госкомпечати вызрела идея объединения ряда литературно-художественных, общественно-политических изданий – «Голас Радзімы», «Літаратура і мастацтва», «Наша слова» и др. — в одно.**

**Особую тревогу журналистской общественности вызвала публикация в правительственной газете «Знамя юности» от 22 августа этого года статьи «Подстрекатели». В ней не только названные выше газеты, но и все белорусскоязычные издания — государственные и негосударственные — обвиняются в пропаганде политики БНФ и, по сути, в антигосударственной, антипрезидентской направленности.**

**По инициативе Белорусской ассоциации журналистов (БАЖ) упомянутые факты были обсуждены на встрече актива БАЖ, а также руководителей и корреспондентов ряда государственных белорусскоязычных изданий с представителями Госкомпечати Беларуси, состоявшейся 27 августа этого года. Многие участники встречи высказали озабоченность в связи с интервью Председателя Госкомпечати Владимира Бельского газете «Звязда» от 23 августа этого года. Особое непонимание вызвали высказывания г-на Бельского о том, что исполнительный орган власти, коим является госкомитет, имеет право «контролировать исполнение законов государства». Кроме того, со слов Председателя Госкомпечати следует, что комитет берет на себя функции цензора и что «нарушение законов объективности (!) изложения информации будет караться финансово».**

**На основании сказанного выше Белорусская ассоциация журналистов от имени участников встречи приняла решение направить данное заявление в подкомиссию по средствам массовой информации Верховного Совета, а также всему Верховному Совету с просьбой:**

***дать юридическую оценку законопроекту «О государственной поддержке СМИ» еще на стадии его подготовки, провокационной публикации в газете «Знамя юности», а также высказываниям председателя Госкомпечати Беларуси, которые идут вразрез с законом о печати.***

**Кроме этого, Белорусская ассоциация журналистов высказывает глубокую тревогу в связи с последними фактами неприкрытого наступления на независимые СМИ. Это, во-первых, касается финансовых проверок, начавшихся почти одновременно во всех крупных негосударственных периодических изданиях: «Белорусская деловая газета», «Белорусская газета», «Белорусский рынок», « Minsk ekonomic news», «Свабода» и т.д., что свидетельствует о масштабной кампании против независимой прессы.**

**Однако наиболее возмутительным фактом является запрет с первого сентября этого года выхода в эфир по надуманной причине радио «101,2» — единственной белорусскоязычной радиостанции, вещавшей на диапазоне FM, завоевавшей уже популярность аудитории ( и не только молодежной) объективностью и разнообразием информации.**

**Речь идет не только об интересах тысяч слушателей, зарубежных партнеров, рекламодателей. Речь идет о попытках исполнительной власти накануне референдума, инициированного президентом, окончательно лишить граждан Беларуси права на информацию из независимых источников, лишить СМИ в целом их основной функции — быть трибуной общественной мысли.**

**Белорусская ассоциация журналистов призывает депутатов Верховного Совета, всех белорусских журналистов, коллег в разных странах мира, международную общественность проявить солидарность в борьбе за сохранение свободы слова и общепризнанного права на свободное распространение информации в нашей стране. От этого зависит судьба демократии в Беларуси.**

**2 сентября 1996 года.**

# СТАТУТ

## БЕЛАРУСКАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ЖУРНАЛІСТАЎ

## BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS STATUTE

### 1.АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1.Беларуская асацыяцыя журналістаў (у далейшым БАЖ) - самастойнае добраахвотнае аб'яднанне грамадзян, якія займаюцца журналісцкай дзейнасцю або садзейнічаюць яе развіццю на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.2.БАЖ дзейнічае ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, дзеючым заканадаўствам і гэтым Статутам на прынцыпах добраахвотнасці, раўнапраўя сваіх сяброў, самакіравання і галоснасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.3.БАЖ з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны баланс, разліковы і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў, пячатку, штампы, бланкі і іншую атрыбутыку. БАЖ ад свайго імя заключае дагаворы, набывае маёмасныя, асабістыя немаёмасныя правы і нясе абавязкі, выступае ва узаемаадносінах з юрыдычнымі асобамі, выступае істцом і адказчыкам у судах.

1.4.БАЖ адказвае па сваіх абавязацельствах маемасцю, на якую па дзеючаму заканадаўству можа быць накіравана спагнанне. БАЖ не нясе адказнасці па абавязацельствах сваіх сяброў, а яны не нясуць адказнасці па абавязацельствах БАЖ.

1.5.БАЖ можа ўступаць у міжнародныя грамадскія аб'яднанні, удзельнічаць у стварэнні міжнародных саюзаў журналістаў, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні, якія не супярэчаць міжнародным абавязацельствам Рэспублікі Беларусь.

### 1. REGULATIONS

1.1. Belarusian Association of Journalists (BAJ) is an independent voluntary union of people involved in the practical journalism, or those promoting journalism on the territory of the Republic of Belarus.

1.2. BAJ acts on the territory of the Republic of Belarus according to the Constitution of the Republic of Belarus, the currant Law and through this Statute. The BAJ activity is based on the principle of voluntariness, equality of rights for its members, self-government and glasnost.

1.3. The BAJ is a juridical person. The BAJ has an independent balance of payments, a pay-account and the other bank accounts, the seal, stamps, official forms and the other atributes. The BAJ on behalf of its name makes contracts, obtains proprietary and personal non-proprietary rights and carries out the responsibilities. The BAJ acts in relations with juridical persons, takes part of either plaintiff or defendant on trails.

